**Іванова, Т.** Вайной абпалены / Т. Іванова // Браслаўская звязда. — 2009. — 7 лют. — С. 3.

**ВАЙНОЙ АБПАЛЕНЫ**



У хатнім альбоме Пятра Сяліцкага вялікі збор аматарскіх фотаздымкаў перыяду службы ў арміі на ўзбека-афганскай граніцы і вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Гаспадар кажа, што іх больш за сто і кожны – гэта зафіксаваны маленькі эпізод жыцця працягласцю ў два з палавінай гады, насычаных будзённымі, радаснымі і трагічнымі падзеямі вайсковай службы. Яе рэаліі аказаліся далёкія ад дзіцячага ўспрымання, калі практычна кожны хлопчык бачыў сябе са зброяй у руках, марыў пастраляць з сапраўднага аўтамата. Яго пакаленню давялося пастраляць не толькі на стрэльбішчы і палігоне. Многіх, як некалі іх бацькоў і дзядуляў, апаліла вайна.

Пятру пашчасціла. Ён трапіў на тэрыторыю гэтай краіны, калі баявыя аперацыі ўжо згортваліся, пачыналася падрыхтоўка да вываду войскаў. Яшчэ, як кажа, пастрэльвалі, гінулі людзі, але гэта быў ужо канец вайны. На машынах, танках, строем савецкія воіны пакідалі Афган, несучы ў сваіх сэрцах боль страт і памяць пра тых, хто вярнуўся на радзіму ў цынкавай труне ці лічыўся прапаўшым у чужой краіне. Бяспечны вывад жывым забяспечвалі розныя часці, у тым ліку і пагранічнікі, да якіх належаў П. Сяліцкі. Ля моста Хайратон, па якім выходзілі нашы войскі, знаходзіўся пагранічны пост, дзе незадоўга да гэтага нёс з таварышамі варту Пётр. Яны добра ведалі наваколле па абодва бакі граніцы, сцежкі, па якіх мог падысці да ахоўваемага аб'екта праціўнік. Таму іх каманду не адправілі дахаты пасля заканчэння тэрміну службы, а затрымалі яшчэ на паўгода на перыяд вываду войскаў. Так яшчэ адзін наш зямляк стаў «афганцам».

Дахаты вярнуўся ў 1989 годзе, перад 8 сакавіка. Для маці гэта быў самы дарагі за ўсё жыццё падарунак ад сына: жывы і здаровы, ён стаяў на парозе дома. З таго часу мінула ўжо 20 гадоў. Увесь гэты час Пётр Іванавіч працуе вадзіцелем у аўтапарку. Тут ён пачынаў сваю біяграфію, адпрацаваўшы да арміі некалькі месяцаў слесарам. Сюды вярнуўся пасля службы. На старэнькім ГАЗ-52 скалясіў раён. Паказаў сябе дысцыплінаваным вадзіцелем. Таму кіраўніцтва АТП праз пэўны час прапанавала яму павучыцца, здаць на катэгорыю «Д» і перасесці на аўтобус. Так і зрабіў. Асвоіў прыгарадныя маршруты, а потым перабраўся на міжгароднія. Цяпер абслугоўвае пасажыраў, якія едуць у Мінск, Віцебск, Полацк і Наваполацк. Жартуе, што ведае амаль усіх пастаянных сваіх кліентаў па імя, а таксама патрэбы, па якіх яны адпраўляюцца ў дарогу.

Стрыманы, ветлівы, Пётр Іванавіч умела будуе адносіны з таварышамі па працы і пасажырамі. Таму ў яго не здараюцца канфлікты, людзі задаволены яго работай, якую ён, дарэчы, знаходзіць для сябе пастаянна, бо і вольны час не любіць бавіць ля тэлевізара або за чаркай. Лічыць, што існуе шмат іншых цікавых заняткаў. Асвоіў, напрыклад, разьбу па дрэве. Іграе на духавых інструментах. З задавальненнем рыбачыць. А цяпер узяўся за будаўніцтва дачы.

**Т. Іванова**